Азарка, В.У. Праца з тэрмінамі як адзін са шляхоў фарміравання моўнай асобы настаўніка пачатковых класаў / В.У.Азарка // "Надзённыя праблемы лексікалогіі і анамастыкі славянскіх моў": матэрыялы II Міжнароднай навуковай канферэнцыі, г. Мазыр, 22-23 крас. 2010 г./ рэдкал.: В.В.Шур (адк. Рэд.).– Мазыр: УА "МДПУ імя І.П.Шамякіна", 2010. – С. 310-311.

**В. У. Азарка** (Беларусь, БГПУ)

# ПРАЦА З ТЭРМІНАМІ ЯК АДЗІН СА ШЛЯХОЎ ФАРМІРАВАННЯ МОЎНАЙ АСОБЫ НАСТАЎНІКА ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАЎ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Сацыяльна-эканамічныя, культурна-прававыя змены, якія адбываюцца ў нашай краіне, вылучаюць новыя патрабаванні да прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў. Адукаванасць, ініцыятыўнасць, прафесійнная мабільнасць, здольнасць адаптавацца да зменлівых умоў, уменне пісьменна і ясна выказаць сваё меркаванне – вось якасці, якія забяспечваюць канкурэнтаздольнасць і сацыяльную абароненасць маладых спецыялістаў на рынку працы. Тэарэтычныя веды ў наш час разглядаюцца ўжо не як мэта, а толькі як сродак навучання, адбываецца паступовае змяшчэнне акцэнтаў у бок кампетэнтнаснага падыходу ў прафесійнай падрыхтоўцы.

Праблема фарміравання моўнай асобы любога спецыяліста з'яўляецца адной з самых актуальных у дыдактыцы вышэйшай школы, што ўжо гаварыць пра фарміраванне сістэмы камунікатыўных кампетэнцый настаўніка, які пастаянна знаходзіцца ў працэсе зносін і сам прызваны выхоўваць моўную асобу вучня.

На аснове канцэпцыі моўнай асобы, прапанаванай Ю. М. Каравулавым, апошнім часам распрацоўваецца тэорыя "прафесійнай моўнай асобы", якую, акрамя вербальна-семантычнага, кагнітыўнага і прагматычнага ўзроўняў [4], характарызуюць таксама:

1) дзейнасць у спецыяльнай (прафесійнай) сферы;
2) здольнасць да актуалізацыі некалькіх сацыяльных роляў;
3) фарміраванне навуковай карціны свету ў працэсе навучання [6].

Фарміраванне прафесійнай моўнай асобы настаўніка пачатковых класаў пачынаецца з засваення тэрміналагічнай лексікі. У адрозненне ад іншых спецыяльнасцей профілю А "Педагогіка", у цыкл сацыяльна-гуманітарных дысцыплін вучэбных планаў спецыяльнасцей 1-01 02 01 "Пачатковая адукацыя", 1-01 02 02 "Пачатковая адукацыя. Дадатковая спецыяльнасць" дысцыпліна "Беларуская мова (прафесійная лексіка)" не ўключаецца. Разам з тым цэлы шэраг задач, прадугледжаных праграмай названай дысцыпліны, у прыватнасці "пашыраць і ўзбагачаць прафесійны лексічны запас будучых спецыялістаў, выпрацаваць у іх уменне

практычнага карыстання тэрміналогіяй і прафесійнай лексікай па абранай спецыяльнасці” [1], павінен быць вырашаны пры вывучэнні іншых курсаў, перш за ўсё на занятках па беларускай мове.

Падчас вывучэння тэмы “Лексіка абмежаванага ўжытку: дыялектная, спецыяльная (прафесійная і тэрміналагічная), жаргонная лексіка” (раздзел “Лексікалогія”) неабходна сфарміраваць навуковае паняцце аб тэрмінах і тэрміналагічных сістэмах, навучыць размяжоўваць тэрміны і прафесіяналізмы. Студэнтам можна прапанаваць:

- параўнаць азначэнні паняцця “тэрмін”, прыведзеныя ў розных навуковых крыніцах, і сфармуляваць найбольш поўную дэфініцыю;
- пазнаёміцца з артыкулам “Тэрміналогія”, змешчаным у энцыклапедычным даведніку “Беларуская мова” [2], і скласці логіка-сэнсавую схему тэксту;
- пазнаёміцца з навуковым выданнем “Тэорыя і практыка беларускай тэрміналогіі” (Мінск, 1999), заканспектаваць асобныя артыкулы або скласці іх тэзісны план;
- перакласці ўрывак з тэксту на беларускую мову і працягнуць разважанні аўтара:

*В результате изучения различных областей специальной лексики было установлено, что наряду с терминами существуют и другие специальные лексические единицы, которые были выделены и описаны: номены (Г.О. Винокур), профессионализмы (Н.П. Кузьмин), профессиональные арготизмы (Л.И. Скворцов) или профессиональные жаргонизмы (Н.М. Гладкая), предтермины и квазитермины (В.М. Лейчик), терминоиды (А.Д. Хаютин), прототермины (С.В. Гринев). Эти специальные лексемы имеют ряд общих признаков с терминами, но имеют и отличия.*

Аналіз вучэбных тэкстаў, прысвечаных праблемам тэрміналогіі, можа суправаджацца дыдактычнымі гульнямі, напрыклад, «Дрэва мудрасці»: прачытаўшы тэкст, студэнт запісвае пытанне на невялікім лістку паперы і прымацоўвае яго на “дрэве”; далей па чарзе кожны здымае адну запіску і як мага паўней адказвае на пытанне; астатнія ацэньваюць пытанне і адказ [3, с. 19].

Працу з тэрмінамі на практычных занятках па беларускай мове неабходна праводзіць пастаянна. Пашырэнню тэрміналагічнага слоўніка садзейнічаюць тэрміналагічныя дыктоўкі, складанне і разгадванне тэрміналагічных красвордаў, дыдактычныя гульні “Алфавіт”, “Забароненыя пытанні” (студэнты павінны вызначыць, які тэрмін загадаў вядучы, пры дапамозе пытанняў закрытага тыпу) [3, с. 17] .

Адно з уменняў, якое павінна быць сфарміравана ў студэнтаў, – уменне даваць азначэнне паняццю. Класічнае азначэнне, як вядома, складаецца з двух частак: з указання на больш ці менш шырокі клас прадметаў (выдзяленне родавага паняцця) і з указання на відавыя

адрозненні, гэта значыць на такія прыметы, праз якія паняцце адрозніваецца ад усіх астатніх. Напрыклад: *Неалагізмы – словы або словазлучэнні, якія з'яўляюцца ў мове для называння новых прадметаў, з'яў ці для замены старых назваў прадметаў ці з'яў* [2, с. 387].

Аднак не заўсёды азначэнне характарызуе прадмет або з'яву вычарпальна поўна і ўсебакова, таму варта навучыць студэнтаў дапаўняць азначэнні за кошт указанняў, тлумачэнняў, апісанняў, разнастайных характарыстык, параўнанняў, выяўлення адрозненняў [5, с. 409]. Выкладчык павінен мець пералічаныя прыёмы ў сваім арсенале, сістэматычна выкарыстоўваць іх на лекцыях і практычных занятках, скіроўваць увагу студэнтаў на спосабы ўвядзення і тлумачэння тэрмінаў пры аналізе вучэбных тэкстаў і падрыхтоўцы паведамленняў.

Будучыя настаўнікі пачатковых класаў павінны авалодаць уменнем папулярнага (яснага для адрасата) выкладу матэрыялу. На думку В.В.Адзінцова [7], такі выклад заснаваны на трох галоўных прынцыпах – лексіка-семантычнага перакладу, канкрэтызацыі абстрактнага паняцця і мастацкасці выкладу. Пералічаныя прынцыпы ляжаць у аснове цэлага рада прыёмаў тлумачэння паняццяў, якія, у адрозненне ад азначэння з яго строга фіксаванай кампазіцыяй і абстрактнасцю, характарызуюцца структурнай разнастайнасцю і канкрэтнасцю, напрыклад:

*лексіка-семантычная аналогія* – перадача сэнсу таго ці іншага паняцця з дапамогай вядомых адрасату слоў;

*вольнае азначэнне*, якое, у адрозненне ад ад класічнага, дапускае апісальны характар кваліфікацыі, у іх могуць выкарыстоўвацца інверсія, антытэза, іншыя фігуры маўлення, што дазваляе найбольш поўна і дакладна зразумець сутнасць паняцця;

*словаўтваральная матывацыя* дазваляе акцэнтаваць увагу аўдыторыі на ўнутранай форме слова, у такім выпадку невядомае тлумачыцца двойчы – праз змест і праз форму;

*этымалагічная даведка* як спосаб тлумачэння не толькі ўносіць элемент займальнасці, але і дазваляе ўзнавіць першапачатковую структуру слова, раскрыць змяненні ў працэсе развіцця мовы;

*прыем "пытанне-адказ"*– пытанне прыцягвае ўвагу адрасата да асабліва значных, як правіла, канцэптуальных "момантаў" зместу.

Дакладнасць тэрмінаўжывання, уменне даваць азначэнні і пры неабходнасці тлумачыць сутнасць тэрмінаў забяспечаць эфектыўнасць камунікацыі ў прафесійным асяроддзі. Пры фарміраванні названых уменняў у студэнтаў факультэта пачатковай адукацыі нельга абмяжоўвацца толькі лінгвістычнай тэрміналогіяй, паколькі для настаўнікаў пачатковых класаў профільнымі з'яўляюцца адразу некалькі тэрмінасістэм – педагагічная, псіхалагічная, лінгвістычная, матэматычная, прыродазнаўчая, мастацтвазнаўчая і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Падводзячы вынік, трэба адзначыць, што механізм фарміравання прафесійнай моўнай асобы настаўніка пачатковых класаў вывучаны недастаткова, аднак аналіз навуковай літаратуры і ўласны вопыт дазваляе выказаць меркаванне, што развіццё адпаведных кампетэнцый праходзіць больш паспяхова пры стварэнні ўмоў, адэкватных будучай прафесійнай дзейнасці.

**Літаратура**


1. Беларуская мова (прафесійная лексіка): тыпавая вучэбная праграма для дысцыплін профілю А “Педагогіка”.– Мінск: РІВШ, 2008.
2. Беларуская мова: энцыклапедыя / пад рэд. А.Я. Міхневіча.– Мінск: БелЭн, 1994.– 655 с.
3. Игры – обучение, тренинг, досуг / под ред. В.В. Петрусинского. – М.: Новая школа, 1994.– 368 с.
4. Караулов, Ю.Н. Русская языковая личность и задачи ее изучения / Ю.Н. Караулов // Язык и личность: сб.ст. / отв. ред. Д.Н. Шмелев. – М.: Наука, 1989. – С. 3-8.
5. Кондаков, Н.И. Логический словарь-справочник / Н.И.Кондаков. – М.: Наука, 1975.– 720 с.
6. Мишланова, С.Л. Профессиональная языковая личность как категория когнитивного терминоведения / С.Л. Мишланова [Электронный ресурс] // Изменяющийся языковой мир: материалы международной научной конференции – Пермь: ПГУ, 2001. – Рэжым доступу: http://language.psu.ru/bin/view.cgi?art=0068&lang=rus. Дата доступу: 20.02.2010.
7. Одинцов, В.В. Речевые формы популяризации: учебное пособие/ В.В.Одинцов.– М.: Знание, 1982.– 79 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ